**Дзяржаўная установа культуры**
**"Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**



# Не змоўкне голас песняра…

**Зборнік па выніках раённага агляду-конкурсу на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства па творчасці Якуба Коласа "Нас слова паэта да творчасці кліча"**

Пінск, 2017


Якуб Колас
135 год
з дня нараджэння

ПАСТАНОВА
Савета аддзела ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі Пінскага райвыканкама

ад 16 лютага 2017г. № г. Пінск

Аб правядзенні сярод бібліятэк
дзяржаўнай установы культуры
“Пінская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма” раённага
агляду-конкурсу на лепшае
тэатралізаванае мерапрыемства
“Нас слова паэта да творчасці кліча”
па творчасці Якуба Коласа

З мэтай азнаменавання 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, народнага паэта Беларусі, грамадскага дзеяча, вучонага, педагога, акадэміка НАН Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, а таксама з мэтай папулярызацыі яго твораў Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі
ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Раённы агляд-конкурс на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства “Нас слова паэта да творчасці кліча” па творчасці Якуба Коласа правесці ў сакавіку 2017 года.

2. Зацвердзіць Палажэнне аб конкурсе, склад журы (дадаткі 1,2)

3. Аддзелу бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц забяспечыць удзел усіх бібліятэк раёна ў аглядзе-конкурсе на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства “Нас слова паэта да творчасці кліча” па творчасці Якуба Коласа.

4. Адказнасць за правядзенне раённага агляду-конкурсу сярод бібліятэк ускласці на дырэктара дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” А.І. Анташук

Старшыня Савета,
начальнік аддзела
ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама Л.В. Галавач

ДАДАТАК №1

**ПАЛАЖЭННЕ**
аб правядзенні сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры
"Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"
раённага агляду-конкурсу на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства
"Нас слова паэта да творчасці кліча" па творчасці Якуба Коласа

## I. Асноўныя мэты і задачы конкурсу:

- азнаменаванне 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, народнага паэта Беларусі;
- актывізацыя дзейнасці бібліятэк па папулярызацыі твораў Якуба Коласа;
- адраджэнне цікавасці карыстальнікаў бібліятэк да твораў Якуба Коласа праз развіццё фантазіі і творчых здольнасцей бібліятэкараў.

## II. Умовы і парадак правядзення конкурсу:

1. У раённым аглядзе-конкурсе прымаюць удзел усе бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма".
2. Конкурс будзе праходзіць па зонах:
   1-я зона: 10.03.2017г. - ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц.
   2-я зона: 16.03.2017г.
   Бібліятэкі Плешчыцкага, Лапацінскага, Ласіцкага, Барычавіцкага, Калавуравіцкага, Хойнаўскага, Дубайскага сельвыканкамаў.
   3-я зона: 17.03.2017г.
   Бібліятэкі Бабрыкоўскага, Лагішынскага, Валішчанскага, Лышчанскага, Мерчыцкага, Парэцкага, Ставокскага, Бярозавіцкага, Ахоўскага, Малоткавіцкага сельвыканкамаў.
   4-я зона: 20.03.2017г.
   Бібліятэкі Аснежыцкага, Пінкавіцкага, Гарадзішчанскага, Сошненскага, Парахонскага, Н-Дворскага, П-Загародскага сельвыканкамаў.
3. Тэкст сцэнарыя прадстаўляецца журы.
4. Працягласць паказу не больш 20 хвілін.

## III. Крытэрыі ацэнкі:

- высокі мастацкі, эстэтычны, інфармацыйны ўзровень сцэнарнага матэрыялу;
- творчы падыход да тэатралізаванага прадстаўлення;
- граматнасць, прафесійны ўзровень;
- выканаўчае майстэрства і артыстызм удзельнікаў;
- музычнае і нагляднае афармленне.

## IV. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў:

1. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў адбудзецца на раённым семінары "Бібліятэка - тэрыторыя культуры" на базе Валішчанскай СБ.

2. Пераможцы (1, 2, 3 месца) ў аглядзе-конкурсе ўзнагароджваюцца дыпломамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Піскага райвыканкама і грашовымі прэміямі.

3. Лепшыя матэрыялы будуць апублікованы ў інфармацыйна-рэкламным бюлетэні "Кругозор" і зборніку "Не змоўкне голас песняра…".

ДАДАТАК №2

да Пастановы Савета аддзела
ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
аб правядзенні сярод бібліятэк
дзяржаўнай установы культуры
“Пінская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма” раённага
агляду-конкурсу на лепшае
тэатралізаванае мерапрыемства
“Нас слова паэта да творчасці кліча”
па творчасці Якуба Коласа
ад “___”___________2017г.

**Склад журы:**

па правядзенню раённага агляду-конкурсу на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства “Нас слова паэта да творчасці кліча” па творчасці Якуба Коласа

1. Галавач Л.В. – начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама.

2. Анташук А.І. – дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”.

3. Міхалевіч К.Л. – загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц.

4. Папіціч Л.І. – галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу.

5. Жылевіч В.І. – метадыст 1-й катэгорыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу.

ПАСТАНОВА
Савета аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
ад «___» ____________2017 г. №___
г. Пінск

Аб выніках правядзення сярод бібліятэк
дзяржаўнай установы культуры "Пінская
раённая цэнтралізаваная бібліятэчная
сістэма" раённага агляду-конкурсу на
лепшае тэатралізаванае мерапрыемства
"Нас слова паэта да творчасці кліча"
па творчасці Якуба Коласа

З мэтай азнаменавання 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, народнага паэта Беларусі, грамадскага дзеяча, вучонага, педагога, акадэміка НАН Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, а таксама з мэтай папулярызацыі яго твораў дзяржаўная установа культуры "Пінская раённая цэнтралізованная бібліятэчная сістэма" правяла раённы-агляд конкурс на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства "Нас слова паэта да творчасці кліча" па творчасці Якуба Коласа.

У раённам аглядзе-конкурсе на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства "Нас слова паэта да творчасці кліча" прынялі ўдзел 39 бібліятэк.

Разглядзеўшы конкурсныя матэрыялы Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прызнаць пераможцамі раённага агляду-конкурсу:
- Валішчанскую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Лазюк С. І.) - І месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма"; *за тэатралізацыю വершаванага апавядання Якуба Коласа "За дождж".*
- Аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц (загадчык аддзелам Самуйлік І. І.) - ІІ месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма"; *за тэатралізацыю вершаванага апавядання Якуба Коласа "Зяць".*
- Лапацінскую бібліятэку-музей А. Блока (бібліятэкар Дзенісевіч С. М.) - ІІІ месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма"; *за тэатралізацыю ўрыўкаў з кнігі апавяданняў Якуба Коласа "Казкі жыцця".*

2. Адзначыць граматамі:

- Парахонскую СБ (загадчык аддзелам Лосіч С. П.) *за тэатралізаванае прадстаўленне казкі Якуба Коласа "Дзед і мядзведзь" у выкананні лялечнага гуртка "Татошкі" Парахоскай сельскай бібліятэкі;*
- Бабрыкоўскую СБ (бібліятэкар Міхалевіч А. М.) *за тэатралізаванае прадстаўленне па матывам верша "Песня над калыскай".*

Старшыня Савета,
начальнік аддзела
ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама — Л. В. Галавач

# Валішчанская
# сельская бібліятэка



# Тэатралізацыя вершаванага апавядання Якуба Коласа
# “За дождж”









**Дзеючыя асобы:**
**Тарэся — вясковая жанчына 45-50 гадоў, лідэр і завадатар па натуры;**
**Аўгеня — 45-50 гадоў, ні ў чым не саступае Тарэсі;**
**Кацярына — 40-45 гадоў, ярая пабарніца старых звычаяў;**
**Юзя — 30 гадоў,**
**Ганна — 35 гадоў — маладыя жанчыны, сяброўкі.**

### З’ява 1

*Дзеянне адбываецца каля калодзежа на вясковай вуліцы, дзе сабраліся вясковыя жанчыны. Адны прышлі па ваду, другія ідуць з поля. Летні, спякотны дзень.*

**Ганна:**
Божа ты мой, Божа!
Што ўжо гэта будзе?

**Юзя:**
Дзе той дождж падзеўся?
Што ён так марудзіць?

**Кацярына:**
Будзе галадоўля,
Людзям безгалоўе,
Прападзе збажынка,
Знішчыцца скацінка…

**Ганна:**
Трэба даваць рады,
Выратоўваць сёлы,
Ліха насланое
Трэба нейк адвесці
Не жывымі ж ў зямлю,
Родненькія, лезці.

**Юзя:**
Ёсць жа тут прычына,
Ёсць яна, няйначай.
Выкрыць яе трэба
Вось у чым задача.

**Кацярына:**
Не шануюць людзі
Ні пастоў, ні святаў.
Хлопцы, падлы, дураць,
Дураць і дзяўчаты.
І калі, наогул,
Глянуць справядліва,
Папсаваны людзі,
Мілачкі, на дзіва!

*З’яўляецца* **Тарэся***: яна ідзе з поля, прыслухаўшыся да размовы жанчын, уступае ў гутарку.*
**Тарэся:**

Дарма, жаначкі, злуяцеся!
А паслухайце лепей мяне вы:
Усё ліха пайшло ад Матэвы! Гэта ён, ліхадзей,
Наклікаў бяду на людзей! *(Паказвае на плот.)*
Ну, дзе ж быць дабру, падумайце самі,
Плот гарадзіў між Юр'ямі!

**Ганна** *(абурана)***:**
Вось дзе яна, тая прычына!
І дзіва, што дажджу няма!

**Юзя:**
Ах, Матэва, Матэва - чума!
Ах, паганец жа ён, лайдачына!
Вось зрабіў хто шкоду!

**Кацярына** *(кідаецца да плота)***:**
Знішчыць к чорту гэты плот,
Каб не было смуроду!

***Аўгеня** выйшла з хаты і падслухоўвае гутарку жанчын, хаваючыся за плотам.*

**Тарэся:**
Ой, гарачкі не парэце!
Як рабіць — то ўжо рабіць:
Трэба ў ночачку да ўсходу
Ціха плот той разбурыць.
А цяпер пайшлі дахаты
І — нікому... Усім — маўчок.

**Ганна** *(*накіроўваючыся дахаты*)***:**
Добра, добра, мы прыйдзём.

***Ганна*** і ***Юзя** выходзяць у адзін бок сцэны.* ***Тарэся і Кацярына*** накіроўваюцца *ў другі бок сцэны.*

**Тарэся** (да **Кацярыны**)**:**
Будзе ноччу нам работа.

*На пустую сцэну з-за плота выходзіць **Аўгеня**, яна ў абурэнні.*

**Аўгеня:**
Ах ты ведзьма праклятая!
Ты не да плоту, а да майго Матэйкі падбіраешся!
Мы яшчэ паглядзім, хто каго!

***Аўгеня** ў абурэнні выходзіць. Сцэна пусцее.*

### З'ява 2.

*На сцэне з'яўляюцца тыя ж жанчыны. У руках у іх — рознае начынне: малаток, сякера, піла.* ***Аўгеня*** *з кіем затаілася за плотам.* ***Юзя*** *з* ***Ганнай*** *тузаюцца з пілою, спрачаюцца.*

**Ганна:**
Хадзем, ну хадзем, Юзя!

**Юзя** *(упіраецца)***:**
А мо не трэба?
Пайшлі дахаты.

*З'яўляюцца **Тарэся** і **Кацярына**.*

**Тарэся:**
Ціха вы, не гаманеце,
Бо абудзіце сяло!

**Кацярына:**
Юзя, Ганна!
Не драмлеце!..
Стой! Куды вас панясло?..

***Юзя*** і ***Ганна** налятаюць на плот.*

**Ганна:**
Вось ён, плот, няшчасце наша!

**Юзя:**
Тут заварана ўся каша!

**Тарэся:**
Раскідайце чортаў плот!

***Тарэся** з сякерай кідаецца да плота, за ёй — усе астатнія. Раптам з-за плота выскаквае з кіем **Аўгеня**.*

**Аўгеня** (*трасучы кіем*):
Раскідаць мой плот?!
Паспрабуй!
Ах ты гадаўка, хвароба!
Дакраніся плоту — адаб'ю ахвоту!
Гэта ўсё твая навука!
Усюды поўзаеш, гадзюка,
Каб каго дзе падкусіць.

**Тарэся** (*апамятаўшыся*):
Не палохай, не палохай,
Шлюндра ты і замазоха!
Не махай мне кіем!
Распусціла губы-трубы! (*Пагражае сякерай.*)
Як махну, дык збярэш зубы
І не так завыеш!

**Аўгеня**:
Ой ты мешалка, завала!
А няшчасны квач!
Каб мяне яна вон гнала?! (*Паварочваецца і паказвае **Тарэсі** зад.*)
Вось табе — пабач!
**Тарэся** (*паказвае **Аўгені** дулю*):
Ах ты, брында і задрыпа!
На табе!

**Аўгеня** (у адказ):
А на і табе!
Што? Укусіла?

**Тарэся:**
А каб ты спраглася!
Ну, чакай жа ты, брахуха!

***Тарэся*** і ***Аўгеня*** *хапаюцца за валасы. Жанчыны кідаюцца іх разнімаюць.*

**Кацярына:**
Годзе! Будзе вам, нябож!

**Ганна:**
Ну палаяліся крышку,
І так будзе, дасць Бог, дождж!
**Юзя:**
Хопіць, бабы!
Людзі ўчуюць
Набярэмся сраматы.

***Тарэся*** і ***Аўгеня*** *працягваюць тузацца.*

**Тарэся:**
Ну, што будзе?

**Аўгеня:**
А не знаю!

**Тарэся:**
Дык пусці!

**Аўгеня:**
Ты пусці, пушчу і я.
*Раптам грыміць гром. Жанчыны адпускаюць адна адну, не могучы ўцяміць, што будзе дождж.*

**Ганна:**
Ой, глядзіце, Тарэся, Аўгеня!

**Кацярына:**
Хмара прэцца ўжо, ды як!

**Юзя:**
Слухайце!
Дождж шуміць па лесе!

*Жанчыны разбягаюцца, застаюцца **Тарэся** і **Аўгеня**. Зноў грыміць гром.*
**Тарэся:**
Аўгеня! Ягадка мая!

**Аўгеня:**Тарэся, галубка!

# Аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц



# Тэатралізацыя вершаванага апавядання Якуба Коласа “Зяць”








*У чытальнай зале ўстаноўлены дэкарацыі. Аформлена кніжная выстава "Пясняр зямлі беларускай". Музычнае суправаджэнне ажыццяўляецца супрацоўнікамі аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц.*

**Аўтар:**
Цешча к зяцю прыйшла ў госці.
Ой, сярдзіты быў той зяць!
Ні пяшчоты, ні мілосці,
А ў мінуты гневу, злосці
Мог і лейцы ў руку ўзяць,
Каб паставіць па-сваему
Ды ў свае ўзяць абцугі.
Не праціўся лепш Ахрэму:
Дасць па карку і - халэмус!
Строгі, хай яго багі!
І пытае дачку маці:

**Маці:**
Ну, дачушка, як жывеш?
Як паводзіцца ў хаце?

**Дачка:**
- Ох, матулька! Што казаці -
Прападзеш з ім, прападзеш!

**Аутар:**
Маладзіца тут у слёзы,
Бэсціць мужа і кляне.

**Дачка:**
- А бадай яго залозы!
Буркатня адна, пагрозы,
Вокам ласкі не зірне.
То яму дзяжа не чыста,
То хлеб прэсны і сыры...
Ой, які ўжо наравісты!
Хоць ты падай прад ім лістам -
І да трох не гавары!
Будзіць рана да работы
Нібы наймічку-слугу,
А рабіць няма ахвоты.
Гора з ім адно, згрызоты -
Жыць тут болей не магу!

**Маці:**
- Плюнь, дачушка!

Чорт яе з пакораю!
Што сябе дарма згрызаці?
Заваліся на палаці
Ды прыкінься хвораю!
Ляжы, нібы ў агні.
Ды войкай, ды стагні
І ад сябе яго гані
Пячы сабе яечню,
А гаду таму, жоху -
Нішчымнага гароху.

**Аўтар:**
І давай вучыць старая,
Як горш зяцю дапячы.
А ён дзверы адчыняе!

**Зяць:**
Так, так, матка, навучы,
Каб цябе зямля сырая!
Каб разумная ды добрая была,
Ты б на троп дурную навяла,
На дабро б наюравала,
Гультаіна ты, завала,
Звадыяшка ты, сава,
Дубовая галава!
Ты ў чыю ж гаворыш руку
І сыкаеш вужакаю?
Ану, цешча, за навуку
Хадзі вось падзякую!

**Аўтар:**
Вывеў цешчу ён вон з хаты
Ды ў борану яе ўпрог!
Аж бражджаць у цешчы пяты,
Проста пыл курыць з-пад ног,
Цягне борану па полі,
Толькі стрыбалю мігцяць.

**Зяць:**
Ся, малая! Гэй, паволі
Но, кабыла!

**Аўтар:**
Выпраг цешчу зяць сярдзіты
Ды па цешчы пугаўём!
Цешча коціцца кулём,

Ды праз поле, ды праз жыта
Смаліць к дзеду перуном.

**Маці:**
Ой, барзджэй ты, дзед, збірайся,
Ідзі дочку ратаваць!
Толькі ж сам асцерагайся:
Гэта кат нам, а не зяць!

**Аўтар:**
А дед слухаў, зубы сцяўшы,

**Цесць:**
Ці праўдзіва ж гэта весць?

**Аўтар:**
І нарэшце, палку ўзяўшы,
Сам да зяця едзе цесць.
За дзвярамі зяць стхарыўся,
Вуха к дзірцы прылажыў,
Слухаў ён, не варушыўся,
Што цесць жонцы гаварыў.

**Бацька:**
Ой, дурная ж ты, дачушка!
Ці ж без працы можна жыць?
Выкінь дур ты гэту, служка!
Мужу трэба наравіць.
Ён, няпраўда, не нягодны,
Не дурны ён, не гультай.
Дык жывеце, дзеткі, згодна
Ды язык ты свой трымай.

**Зяць:**
Люба слухаць, што да ладу!
За разумную дараду
Ты на покуць, бацька, сядзь!
Смаж, брат жонка, каўбасу,
А я скочу ў камору
І гарэлкі прынясу.

**Аўтар:**
Запішчалі ў печы скваркі,
Аж звініць скаварада.
З рук у рукі ходзіць чарка,
Чэсць такая, што бяда!
Выпіў цесць і з'еў на славу,

Хоць жывот расперажы.
Зяць уважны і ласкавы,
Хоць да раны прылажы!

**Зяць:**
Захадзі ж да нас, старэчы,
Ды часцей, не забывай!

**Аўтар:**
І зваліў яму на плечы
Здаравецкі каравай.

Дзед ідзе сабе, спявае,
Нібы зяць адмаладзіў.
Каравай ён ледзь трымае,
Аж плячук наверадзіў.
Цешча рукі заламала,
Дзеда згледзеўшы здалёк:

**Маці:**
Во! Я борану цягала,
Цесць з ярмом дамоў уцёк!

Лапацінская бібліятэка-музей
Аляксандра Блока




# Тэатралізацыя апавяданняў Якуба Коласа “Казкі жыцця”




КАЗКІ
ЖЫЦЦЯ




КАЗКІ
ЖЫЦЦЯ

*На сцэне ўстаноўлены дэкарацыі. Музычнае суправаджэнне ажыццяўляецца работнікамі Лапацінскага СДК.*

**Вядучы:** Якуб Колас!..У літаратурным псеўданіме Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча, народнага паэта Беларусі Якуба Коласа - шмат сэнсу і чалавечага цяпла. Гэтым псеўданімам яшчэ на пачатку сваёй творчай дарогі малады паэт падкрэсліў, што жыццём сваім і творчасцю заўседы будзе цесна звязаны з народам, з роднай зямлёй, што з жыцця народа, як з найглыбейшай крыніцы, будзе чэрпаць думкі і надзеі, тэмы і вобразы.

Слова - радасць, слова-чары,
Вобраз вечна юных вёсен,
Ёсць ты ўсюды: у сонцы, у хмары,
Ты глядзіш праз неба nросінь.
Лашчыш слых мой, слова-ззянне,
Атуляеш сэрца ласкай,
Ноч і вечар, дзень, світанне
Абняло ты, слова-краска.

А ці не бывае так, што выдумка ходзіць, як праўда, а чыстую праўду лічаць за выдумку? А калі так, дык прашу слухаць уважна. Не ведаю як каму, а нашым героям жылося зусім нявесела.

**Аўтар:** Ішоў мужык з цыганом. Пустая торба ў аднаго і ў другога. Есці абодвум хочацца, хоць зубамі ляскай. На іх шчасце ехаў пан на маёўку. Вёз ён з сабою ўсякай яды і закускі. З брычкі выкінуўся ўжараны гусак. А цыган з мужыком як ішлі, дык і знайшлі шчаслівую знаходку. Аж сліна пацякла ў іх з рота, як глянулі яны на гусака. Кінуўся цыган на хітрыкі.

**Цыган:** Вось што, браце, як мы будзем есці ўдвух, то ні ты, ні я не наямося. А мы зробім так: ляжам спаць, і хто сасніць лепшы сон, той няхай бярэ ўсяго гусака.

**Мужык** *(чухаючы патыліцу)*: Добра.

**Аўтар:** Звярнулі яны з дарогі, выбралі цянёк і паляглі. Цыган зараз і захроп, быццам спіць. Але дзе ўжо той сон пойдзе на пусты жывот. Не спіць цыган, хоцъ і храпе, усе думае, які бы выдумаць сон. А мужык тым часам скраўся паціхеньку, за гусака, адышоўся за куст, каб не бачыў цыган, і стаў уплятаць гусака за абедзве шчокі. Толъкі адны голенькія костачкі асталіся ад панскага гусака. Напіўся мужык з крыніцы, лёг, адразу заснуў. Спіць як пшаніцу прадаўшы. Устае цыган, будзіць мужыка.

**Цыган:** Уставай, браце! Спі, не спі, гэтага не сасніш, што сніў я.

**Мужык** *(падняушы галаву)*: Што ж ты там сніў?

**Цыган**: Ого, што я сніў! Сніў я, браце, здаецца стаяць драбіны, высокія, аж да самага неба. Я гэта на драбіны, здаецца, узлез аж на самае неба. Бачу, на небе

Бог, каля Бога ангелы. Бог п'е гарбату; ляжыць сала. Паклікае, здаецца, мяне Бог, частуе гарбатаю, салам...

**Мужык** *(перапыняе цыгана):* Дык я бачыў, як ты палез на неба, бачыў, як піў гарбату. Чаго ён пойдзе сюды? - думаю сабе. - Няўжо ж ён будзе есці гэтага няшчаснага гусака пасля гарбаты і сала? І чаго ён пойдзе сюды? Узяў я, браце, ды прыняў драбіны, думаў, што ты не вернешся адтулъ, і гусака з'еў. І як ты злез адтуль без драбін, чорт цябе ведае.

**Аўтар:** І засталося беднаму цыгану смактаць голыя косці.

**Вядучы:** А зараз паслухайце яшчэ адну казку... Жылі-былі дзед і баба. Хораша жылі яны між сабою. За усё сваё жыццё яны не толькі ні разу не пабіліся, але і не пасварыліся нават. А вядома, што чорта аж дрэнчыць, калі людзі сагласна жывуць між сабой. На якія хітрыкі ні кідаўся чорт, каб звесці дзеда з бабаю, нічога не памагала. Пробаваў ён кідаць у гаршок з капустаю вуглі і сажу. А дзед і вухам не вядзе: выкіне з капусты вуглі, есць ды бабу хваліць, што яна добрая гаспадыня. А дзеда ўночы завёў раз чорт у бабіну расаду і вытаптаў яе дзедавымі нагамі. Авось, думае, пачастуе баба дзеда чапялой. Не! І нібыта таго! Аж пахудзеў чорт ад злосці. Раз сустрэўся чорт з адною кабецінаю. Хітрая была баба, першая звадыяшка ў сяле.

**Чорт:** Скажы мне, кабетка. Ці можна звесці пабіцца мужа з жонкаю, каторыя ніколі не сварыліся і не злуюць адно на однае?

**Кабета:** Ото дзіва, што можна.

**Чорт:** Ну звядзі ж ты дзеда з бабаю.

**Кабета:** А купіш мне чаравічкі?

**Чорт:** Усё куплю, што хочаш, звядзі толькі.

**Аўтар:** Прыйшла звадыяшка да бабы. Ведала яна, што баба любіць і шануе дзеда.

**Кабета:** Знаеш, галубачка, што я табе скажу? У твайго дзеда вырас на галаве сівы волас. Калі ты не выражаш яго брытвай, то дзед твой памрэ. І глядзі, нічога не кажы дзеду пра гэты волас.

**Аўтар:** А дзеду яна сказала *(дзед гарох сеяў на полі).*

**Кабета:** От, дзедка, распусціў ты сваю бабу. Хоць бы пакрычаў ты на яе: яна ж надумалася зарэзаць цябе!

**Дзед:** Што ты тут брэшаш?! Ці не звар'яцела?

**Кабета:** Ну. Глядзі, каб потым не каяцца.

**Аўтар:** Не паверыў дзед лгару. Прыйшоў дзед у хату. Наліла баба міску крупніку, селі есці.

**Баба:** Дай, дзедка, пашукаю ў галаве.

**Аўтар:** Палажыў дзед галаву бабе на колені. Стала баба шукаць і праўда: сівы волас! Аж у жар кінула бабу (а ў дзеда было многа сівых валасоў.

**Аўтар:** Дастае баба тайком ды ціхачом з-за пазухі брытву. А дзед адным вокам цікуе на бабу. Як толькі баба адчыніла брытву - трах дзед бабу па мордзе. А баба дзеда за чуб. Чорт на гары аж скача з радасці. Купіў чорт бабе-звадыяшцы чаравікі, але баіцца аддацъ іх проста бабе - з рук у рукі. Выразаў ён даўжэразную тычыну, пачапіў на яе чаравікі і аддаў іх бабе.

**Вядучы:** З таго часу і пайшла гутарка: "Дзе чорт сам не зможа. Туды ён бабу пашле".
Не ў адной толькі нашай душы
Зерне ёсць хараства -
Аб ім казку складае ў душы
Колас нівы, трава.
Не ў адным толькі сэрцы людзей
Іскра праўды гарыць -
Аб ёй песню пяе салавей,
Аб ёй рэчка журчыць.
У той песні, шырокай, як свет,
Чутны ветрык і гром..
Дык прымі ж ты прывет,
Свет бязмежны, мой дом.

**Вядучы:** Як вядома, героі казак вельмі часта з'яўляюцца на свет у выніку тых ці іншых надзвычайных праяў. Гаворка пойдзе пра хлопчыка, які нарадзіўся ў тую самую ноч, калі зацвітае папараць. Ён нават і імя даў сабе сам: імя тае ночы. У тую самую ноч, калі цвіце папараць пазбіраліся на сходку русалкі, ваўкалакі, вадзянікі, дамавікі, здані і чараўнікі розных гатункаў. Ім хацелася паслухаць, аб чым будзе гаварыць сход. Аб Юнаку была гутарка тут. Усім спадабалася якраз тое, што гэты Юнак даў сабе імя ночы, калі цвіце папараць і калі фантастычныя істоты праводзяць свае сходы. І цяпер яны думалі, які падарунак зрабіць Юнаку.

**Месяц:** Старшынёю сходу абраны Лясун.

**Лясун:** Дык хто чым хоча парадаваць Юнака?

**Русалкі:** Мы навучым яго спяваць прыгожыя песні, бо песні ва ўсіх выпадках жыцця патрэбны чалавеку. З песнямі лягчэй на свеце жыць.

**Вадзянік:** А я дам яму "Гуслі". Няхай апявае былую славу свайго народа і закідае ў сэрца яго імкненне заняць пачэснае месца між славянамі.

**Месяц:** А я пайду з ім "Шляхам жыцця" і буду асвятляць дарогу, каб яму лягчэй было прабівацца. Ён убачыць "Раскіданае гняздо" свае Айчыны і раскажа аб ім

людзям. У дарозе ж ён спаткаецца з мілаю "Паўлінкаю" і расказам аб ёй людзей падвяселіць.

**Ваўкалак:** У мяне крэпкія, гонкія ногі. Я пішу па зямлі сотні, тысячы вёрстаў. Я занясу на край свету яго песні і думкі, каб молатам білі яны па струнах сэрца таго, хто пакідае сваю Айчыну.

**Лясун:** А што я дам яму? Я загадаю маім пушчам-лясам расказваць яму пра свае адвечныя тайнасці. Я авею яго песні шумам бароў. Іх украсаю будзе мудрасць векавечных дубоў. Я дам яму гарт і цвёрдасць граба, каб да канца Юнак быў верны свайму народу, і ён пакіне народу вялікую "Спадчыну".

**Вядучы:** "Казкі жыцця" - гэта спадчына, падараваная нам Якубам Коласам, гэта наш скарб, пранікнёны пяшчотай, шчырасцю і любоўю да роднага краю.

Парахонская
сельская бібліятэка



Лялечнае прадстаўленне
вершаванай казкі Якуба Коласа
“Дзед і мядзведзь”









*На сцэне ўстаноўлены дэкарацыі для лялечнага прадстаўлення. Афармлена кніжная выстава "Пясняр зямлі беларускай". Музычнае суправаджэнне ажыццяўляецца бібліятэкарамі Парахонскай СБ.*

*Дзед з бабай прыходзяць з вуліцы. Баба нясе вядро. Дзед граблі. Баба заглянула ў кораб.*

**Баба:**
Дзеду, з хлебам слаба
Едзь у млын ты, дзедка!
**Дзед:**
Млын не страшан дзеду,
Трэба, дык паеду,
Бабка, мая кветка!
Дык давай сняданак
Менш завозу зранку
Справа, бач такая.

*Баба гатуе сняданак. Дзед каля бабы стаіць.*
**Дзед:**
Ат, і скавародка
Ходзіш лётка,
Спрытна ў бабіных руках.
Скваркі ў печы
Штось дарэчы
Шэпчуць той скаварадзе.
**Баба:**
Вось гатовы,
Дзед, сняданак.
**Дзед:**
Дзякуй баба за яду.
А я пайшоў ў двор
Кабылку пашукаю.
**Баба:**
Ідзі дзядок, ідзі.

*Баба праводзіць дзеда на вуліцу.*
**Дзед:**
Колы дзёгцем квацану,
Нацяну тужэй атосы,
І заткну шчыльней загваздю.
*Баба выглядае ў вакно. А дзед тым часам кладзе мяшкі на воз.*
**Баба:**
І мяшкі паклаў дзядуля
Дуж дзядок, мой і здароў
І пайшоў, мой дзед ў поле

За кабылкаю сваёю.

*Баба выходзіць з хаты. А дзед выходзіць за кабылай у поле.*

**Дзед:**

Кось - кось - кось! Заве кабылу.
Кось - кось -кось!
Я ўжо ведаю твой звычай
Эх, кабылка, воўча мяса,
Ну і шкодніца ж яна!
Так і шворыцца адна,
Лезе ў шкоду самапасам.
А бадай жа яе качкі?
Кось - кось - кось.
Трэба ў млын, яе ж няма!
Час той зводзіцца дарма
З-за кабылкі, з-за лайдачкі!
Там у лесе ходзіць хтосьці?
Знаю нораў твой, нябось,
І натуру твайго брата!

*Паказваецца мядзведзь. Скраўся дзед і - хоп за грыву. Мядзведзь зароў.*

**Дзед:**

Ой-ой. Ды мядзведзь жа гэта.
Тпрру, спыніся! Стой мядзведзь!

*З-за дрэў выглядаюць Заяц і Ліса.*

**Заяц:**

Што за грукат, што за крык?

**Ліса:**

Глядзі, глядзі. Гэта ж дзед бяжыць з мядзведзем.

**Заяц:**

Ну і дзед. Ну і даў жа ён маху.
Смех сказаць суседзям!
Як ён не разгледзеў
Ды сеў на мядзведзя!

**Ліса:**

А галінкі - лапкі
Збілі дзеду шапку.
Заяц, паглядзі.
Аб бярозу-вітку
Разадраў дзед світку,
А аб пень дубовы
Гуз набіў здаровы.
Ты не бачыў, заяц,
Вось такога дзіва

Дзеда на мядзведзі.
**Заяц:**
Ой, звяры, вы, мае братцы!
Памажэце мне смяяцца! Ха-ха-ха.
**Мядзведзь:**
Дзед адпусці скарэй мяне.

*Дзед адпусціў мядзведзя і гопнуўся аб зямлю.*
**Ліса:**
Распасцерся, бы япрук,
На зяленым моху. Ха-ха-ха.

*Дзед падымаецца.*
**Дзед**:
Ох-ой. Ой вы мае косці. Кыш адсюль.
Вось брыда, мядзведзь!
Адкараскаўся ледзь!
А бадай ты спрах!..
Аж гудзе ў вушах!
Пайшоу я дахаты.

*Ідзе дзед дахаты.*
**Дзед:**
Ой-ой. Баба, баба!
Прыйшоў дзед дахаты.

*Баба выходзіць з хаты.*
**Баба:**
Што з табою дзедка.
А дзе ж твая шапка?
Як табе не брыдка -
Разарвана світка.
**Дзед:**
Пераблытаў я кабылу.
Сеў на мядзведзя.
І мядзведзь насіў па лесе.
Усе бакі адбіў я. Ой - ой - ой!
**Баба:**
Ха-ха-ха. Ой, ты дзед-дурыла,
У хляве кабыла!
Дык вазьмі за нораў -
Не хадзі за горы,
А перш каля носу
Пашукай ты лесу.
**Дзед:**

Скажы дзякуй, баба,
Што прынес я драбы!

*Баба замітусілася каля дзеда.*
**Баба:**
Дык сядай, дзед на вазок.
За кабылкай я пайду.
А вось і кабылка!
Стой ,кабылка, запражэм
Ды паедзем з дзедам у млын.
Дзед сядзіш?
**Дзед:**
Сяджу.
**Баба:** Но, кабылка, но!

Бабрыкоўская
сельская бібліятэка



# Тэатралізаванае прадстаўленне па матывам верша "Песня над калыскай"











*Афармленне залы: сцэна ўпрыгожана ў нацыянальным стылі. Афармлена кніжная выстава "Пясняр народнага шчасця". Гучыць ціха спеў птушак.*

**Вядучы:** Добры дзень, паважаныя сябры! Бабрыкаўская сельская бібліятэка запрашае Вас на тэатралізаванае мерапрыемства па матывам верша "Песня над калыскай" да 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа.

*Гучыць верш "На полі вясною"*
Люблю я прыволле
Шырокіх палёў,
Зялёнае мора
Ржаных каласоў.

І вузкія стужкі
Сялянскіх палос
Люблю цябе, поле.
Люблю я твой плёс.

Ігрушы старыя,
Што ў жыце шумяць,
Зялёныя межы,
Далёкую гладзь.

Люблю я ўзгоркі
І насып-курган,
І сіняй далечы
Празрысты туман...

Калышацца жыта,
Радамі бяжыць,
А хваля паветра
Дрыжыць і дрыжыць...

Люблю я прыволле
Шырокіх палёў,
Зялёнае мора
Буйных каласоў.

*Гучыць песня па матывам верша "Песня над калыскай"*

Аа-аа, мой сынок!
Аа-аа, мілы!
Не крычы, не плач: дарэмна
Ты патраціш сілы;
А без сілы, мой сынок.
Жыць па свеце трудна...
Ой ты, вецер, не шумі, -
Не спявай, так нудна!

Спаць Міхаську не даеш...
Спі, мой сын маленькі!
Я цябе пакалышу
Ай, люлі-люленькі!
Што цябе чакае, сын?
Што твая за доля?
Можа й ты пот будзеш ліць
У чужое поле?..
Будзеш летам ты хадзіць
На плыты, па згоны,
З Коўны матцы прынясеш
Хоць гарсэт чырвоны...
А то, можа, купіць пан
Твае рукі, сілы?
Паднявольным будзеш ты,
Сын мой, да магілы!

**Вядучы:**
А мо ў школку пойдзеш ты.
Будзеш чалавекам,
Без навукі цяжка жыць
Гэтым трудным векам.
Кінеш матку, па чужых
Ты па людзях пойдзеш
І на шчасце нападзеш,
Долю сваю знойдзеш.
Матку ўсномніш ты сваю,
Як цябе люляла,
Як табе ўначы не раз
Песенькі спявала.
І гасцінца мне прышлеш,
Не забудзеш маткі
Вось уцешуся тады.
Аж запляшчу ў ладкі!..
Аа-аа, мой сынок!
Люлі, люлі, мілы!
Ой, не плач ты, не крычы,
Набірайся сілы!

| | |
|---|---|
| **Складальнік,** | |
| **камп'ютарны набор і афармленне** | **К. Л. Міхалевіч** |
| **Рэдактар** | **А. І. Анташук** |

**Пінская цэнтральная раённая бібліятэка**
**імя Яўгеніі Янішчыц**

**г. Пінск, вул. ІПД, 35**
**тэл. 8 (0165) 32 23 66**

**e-mail: crbpinsk@tut.by**